Па праву першых назавём іх імёны і адукацыю:

- Акімава В.І. – вышэйшыя жаночыя курсы Лесгафта ў Петраградзе;
- Арлова Антаніна Іванаўна – петраградскія жаночыя курсы;
- Бер Кацярына Мікалаеўна – вучылася ў сярэдняй школе;
- Залеская Соф'я Львоўна – ВНУ
- Карагодзіна Вера Іванаўна – двухгадзічныя курсы пры Харкаўскім інстытуце. [5, л. 22-23.]

Першую адміністрацыйную кар'еру ў гісторыі МДУ зрабіла, па тых дакументах, што маюцца ў нас на сённяшні дзень, Арлова Ларыса Васільеўна. У свой час яна скончыла курс сярэдняй школы, вышэйшыя курсы Лехвіцкай Скален і вышэйшыя Сцебуцёўскія сельскагаспадарчыя курсы. Таму невыпадкова, калі ў пачатку 1921 г. Савет інстытута абмяркоўваў пытанне аб стварэнні навучальна-узорнай гаспадаркі ў в. Красніца Вендржскай воласці Магілёўскага павета, то Л.В. Арлову адзінагалосна абралі загадчыцай узорна-паказальнай фермы, якой яна з вялікім поспехам кіравала. [5, л. 29]

Жанчыны інстытута ўвесь час актыўна ўдзельнічалі ў яго працы, выбіраліся ў шматлікія камісіі і камітэты. С.Л. Залеская і В.І. Карагодзіна працяглы час уваходзілі ў склад Савета інстытута, які і кіраваў дзейнасцю ўстановы [5]

Вынікі дзейнасці нашай установы ў 1913 – 1923 гг. паказаў, што як толькі былі разблакіраваны магчымасці самарэалізацыі жанчын, як яны актыўна пачалі занімацца грамадскай, сацыяльнай, адукацыйнай дзейнасцю ў новых для сябе сферах. Мужчыны пачынаюць пасоўвацца са звыклых пазіцый. Але гэты працэс цяжка назваць выцясненнем мужчын. Хутчэй жанчыны пачынаюць займаць сваё законнае месца.

**Літаратура:**

1. Агееў А.Р. Аб датах заснавання педінстытута і спробах адкрыцця універсітэта ў г. Магілёве // V абласныя Магілёўскія краязнаўчыя чытанні. – Магілёў, 1994.

2. Агееў А.Р. Да гісторыі адкрыцця настаўніцкага інстытута ў Магілёве // Магілёўшчына. VII вып. – Магілёў, 1997.

3. НГАБ. – ф. 2258, воп. 1. спр. 33.

4. Народное образование в СССР. Образовательная школа. Сб. док. 1917 – 1973 гг. – М., 1974.

5. ДА Гомельская вобласци. – ф.60. воп. 1, спр. 970.

6. Там жа. – спр. 1010.

І.Бамбешка

## ВЫВУЧЭННЕ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ МАГІЛЁЎШЧЫНЫ Ў 1920-ыя гг.

Адыходзячы ў мінулае, кожная эпоха пакідае за сабой след у выглядзе культуры, на падставе якой і фарміруецца агульны гістарычны вопыт. Яго сведчаннямі з'яўляюцца прадметы матэрыяльнай культуры. Гэты тэрмін – матэрыяль-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ная культура – вельмі папулярны сярод навукоўцаў. Існуе вялікая колькасць яго варыянтаў. У дадзеным паведамленні мы будзем прытрымлівацца вызначэння, якое было у свой час прапанавана амерыканскім антраполагам М.Херскавіцам. На яго думку матэрыяльная культура – гэта супольнасць артыфактаў у культуры, велізарнае кола аб'ектаў, неабходных чалавеку для пераўтварэння фізічнага свету, для палягчэння сацыяльных зносін, для задавальнення нашых патрабаванняў, увогуле, усё, што выраблена з матэрыялаў фізічнага свету і што чалавек пакідае пасля сябе. Гэта могуць быць сельска-гаспадарчыя і іншыя прылады працы, будынкі, творы мастацтва, цацкі, прадметы побыту, дарогі, ежа і г.д.[24.С.2.]

Вывучэнне матэрыяльнай культуры прадугледжвае наступныя ці этапы:

1. Назапашванне інфармацыі. Яно адбываецца шляхам арганізацыі розных экспедыцый, паездак і камандзіровак.

2. Навуковая апрацоўка выяўленых прадметаў матэрыяльнай культуры, выяўленне іх характэрных асаблівасцей як крыніц інфармацыі.

3. Выпуск навуковых прац, публікацыя вынікаў навуковых даследаванняў, іх папулярызацыя.

Вывучэнне матэрыяльнай культуры як увогуле усёй Беларусі, так і Магілёўшчыны ў прыватнасці праводзілася рознымі ўстановамі і арганізацыямі. Найбольш актыўна гэтым займаліся установы, якія былі падпарадкаваны Наркамату асветы: Інстытут беларускай культуры (ІБК), Цэнтральнае бюро краязнаўства (ЦБК), музеі і г.д. Таксама прынялі удзел у гэтым працэсе і супрацоўнікі Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення (ЦСУ), якія праводзілі выбарачнае абследаванне асобных населеных пунктаў Беларусі.[2.С.318.]

Народны камісарыят асветы ССРБ быў рэарганізаваны 17 снежня 1920 г. на II Усебеларускім з'ездзе Саветаў (13-17 снежня 1920 г.). У наступным годзе на сходзе працаўнікоў навукі і культуры, які быў скліканы Наркамасветы БССР, наўстала пытанне аб стварэнні Інстытута беларускай культуры. Аднак пэўны час гэта ідэя працыягвала заставацца ідэяй і толькі 10.02.1921 г. пастановай СНК БССР было прынята рашэнне аб арганізацыя навукова-тэрміналагічнай камісіі пры НКА.[23.С.9] Яна з'явілася першым навуковым цэнтрам Беларусі, у межах якой планавалася праводзіць арганізаванае вывучэнне Беларусі, у тым ліку і пытанняў матэрыяльнай культуры. У пачатку 1922 г. быў створаны ІБК як шматгаліновая ўстанова. Структурана ІБК першапачаткова складаўся з 2-х секцый: гуманітарнай і прыродазнаўчай і шэрагу камісій у іх складзе. І таму пытаннямі вывучэння матэрыяльнай культуры займаліся члены розных секцый. Канешне, перш за ўсё гэта былі этнографы. Спачатку асобнай секцыі этнаграфіі ў ІБК не існавала. На агульным сходзе інстытута 26 сакавіка 1924 г. было вырашана арганізаваць замест 2 папярэдніх 7 новых секцый, у тым ліку і этнаграфічную [23.С.14]. Аднак замест гэтага этнографаў аб'ядналі з географамі і такім чынам была створана агульная прыродна-этнаграфічная секцыя, на чале якой стаяў М.Азбукін. Зразумела, што гэта не

спрыяла развіццю навукі. І таму праз пэўны час на нарадзе групы этнографаў прыродна-геаграфічнай секцыі, якая адбылася 4 чэрвеня 1924 г., было вырашана ўвайсці ў гісторыка-археалагічную секцыю.[25.С.47.] На той жа нарадзе вядомаму беларускаму этнографу І.А.Сербаву было даручана арганізаваць этнаграфічную працу на Магілёўшчыне, паколькі той на працягу некалькі гадоў (1919-1921) працаваў там ў губернскім аддзеле народнай адукацыі. 16 чэрвеня на паседжанні гісторыка-археалагічнай секцыі ІБК гэта пытанне было вырашана.[25.С.49.]

У тым жы 1924 г., адразу пасля далучэння Магілёўшчыны да БССР, ІБК арганізаваў экспедыцыю ў новадалучаныя раены.[13.С.183.] У экспедыцыю адправіліся этнограф, супрацоўнік Рускага музея з Ленінграда А.К.Сержпутоўскі і даследчык народнай песеннай творчасці Я.В.Прохараў. Эспедыцыя накіравалася ў Чавускі, Мсціслаўскі і Клімавіцкі паветы Магілёўскай акругі. На працягу жніўня-верасня месяца 1924 г. члены экспедыцыі даследавалі асаблівасці як духоўнай, так і матэрыяльнай культуры. Што тычыцца апошняй, то вывучаліся характэрныя асаблівасці хатняга побыту, гападаркі, народнага мастацтва, у прыватнасці, арнаменту. У дадатак было сабрана каля 50 розных прадметаў матэрыяльнай культуры, якія паступілі ў этнаграфічны аддзел БДМ.[3.С.226.] Пасля вяртання, у верасні 1924 г., на агульным сходзе ІБК была заслухана справаздача ўдзельнікаў экспедыцыі.[9.С.15.] Па ўсёй верагоднасці. звесткі і шматлікія прадметы па матэрыяльнай культуры, прывезеныя А.К.Сержпутоўскім з экспедыцыя, увайшлі ў яго працу "Быт беларусаў", але яна на жаль не захавалася.[2.С.228]

25 ліпеня 1924 г. ЦВК і СНК БССР зацвердзіў новы статут ІБК. Згодна яму стваралася асобная этнаграфічная секцыя. якая аднак была зацверджана толькі ў сакавіку 1925 г. Старшынёй секцыі быў прызначаны С.З.Кацэнбоген, сакратаром І.А.Сербаў. У склад секцыі ўвайшлі таксама вядомыя беларускія этнографы, сярод якіях А.К.Сержпутоўскі, М.В.Мялешка, А.Палесс, Я.В.Прохараў, К.К.Кернажыцкі, А.Грыневіч і г.д.[26.С.107]

У план работы на 1925-26-ыя гг., складзены І.А.Сербавым, былі ўведзены пункты аб вывучэнню матэрыяльнай культуры розных рэгіёнаў Беларусі.[26.С.296] І таму экспедыцыйная дзейнасць па вывучэнню Беларусі разгарнулася з большай інтэнсіўнасцю. Так, улетку 1925 г. на Магілёўшчыну, у раён Срэдняга Дняпра і Сажа выехала чарговая экспедыцыя. На чале экспедыцыі стаяў сакратар этнаграфічнай секцыі І.А.Сербаў. Галоўнай мэтай экспедыцыі было як увогуле антрапалагічнае вывучэнне асаблівасцей беларусаў у дадзеным рэгіёне, так і даследаванне характэрных рыс іх матэрыяльнай культуры ў прыватнасці. У час экспедыцыі ішлі назіранні за пранікненнем новага быту на вёску, выяўляліся погляды сялян на сям'ю, шлюб, царкву і іншыя з'явы звычайнага сялянскага жыцця. Акрамя таго, у час паездкі была праведзена вялікая збіральніцкая работа: складзена калекцыя нацыянальных беларускіх строяў, узораў мастацкага рукадзелля, тканін, усяго каля

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

200 адзінак. Шмат што з убачанага (беларускія тыпы, народныя строі, розныя прадметы побыту і мастацтва) было зафіксавана на фотаздымках. З дапамогай фанографа было запісана каля 50 песняў на ўсе поры года, шмат танцавальных мелодый, якія выконваліся на розных музычных інструментах.[27.С.116]

Аднак поўнасцю рэалізаваць план вывучэння Беларусі на 1925-26-ыя гг. этнографам не ўдалося. У 1926 г. секцыя этнаграфіі была ўключана ў склад сацыяльна-гістарычнай секцыі, у якую былі аб'яднаны гісторыкі, археолагі і этнографы.[2.С.265] У чэрвені 1927 г. СНК БССР зацвердзіў яшчэ адзін новы статут ІБК ужо як самастойнай установы. Згодна новаму статуту структура ІБК была набліжана да акадэмічнай: усе камісіі былі аб'яднаны ў 2 аддзелы: прыроды і гаспадаркі, на чале якога стаяў А.Смоліч, і гуманітарных навук, кіраўніком якога быў прызначаны С.Некрашэвіч. Па статуту 1927 г. У ІБК працавала 17 кафедр і 23 пастаяныя камісіі. У тым ліку была арганізавана і асобная кафедра этнаграфіі. На кафедры была нават створана камісія па вывучэнню быту і матэрыяльнай культуры пад кіраўніцтвам І.А.Сербава. Аднак сярод значнай колькасці экспедыцый, накіраваных у розныя рэгіёны Беларусі, ні адной не было арганізавана на Магілёўшчыну.

Вельмі актыўна ў вывучэнне матэрыяльнай культуры Магілёўшчыны ўключыліся ў 1920-ыя гг і археолагі. У 1923-24-іх гг. дзейнічала гісторыка-сацыяльная секцыя, якая займалася таксама і пытаннямі археалагічнага вывучэння Беларусі. Па новаму статуту ІБК, які быў зацверджаны 25 ліпеня 1924 г. яе існаванне было падцверджана.

Першы сход секцыі адбыўся 24 лютага 1925 г. На ім старшынёй секцыі быў прызначаны вядомы беларускі гіторык, рэктар БДУ, прафесар У.І.Пічэта, намеснікам – С.З.Кацэнбоген, а сакратаром – В.Д.Друшчыц [27.С.58.] Паралельна з секцыяй працавала і гістарычна-археалагічная камісія. І на паседжанні ІБК 1 верасня 1925 г. было вырашана "лічыць прыступіўшым да навуковай працы ў гісторыка-археалагічнай камісіі прафесара М.В.Доўнар-Запольскага на пасадзе навуковага сакратара камісіі з 1 жніўня 1925 г. і З.Даўгялу на [illegible]е навуковага сакратара камісіі з 1 жніўня 1925 г."[27.с.211] Навуко[illegible] супрацоўнікамі камісіі былі А.М.Ляўданскі, К.М.Палікарповіч, С.А.Д[illegible]ні, П.В.Харламповіч і інш. І секцыяй і камісіяй быў намечаны шырокі [illegible] дзейнасці, у тым ліку па вывучэнню "старой матэрыяльнай культуры". Для рэалізацыі гэтага арганізоўваліся шматлікія экспедыцыі, у тым ліку і на Магілёўшчыну. У тым жа 1925 г. па даручэнню камісіі і на сродкі ІБК І.Сербаў адправіўся ў этнографа-археалагічную экспедыцыю на Магілёўшчыну ў раён Нова-Быхава. Там ён абследаваў курганны, гарадзішчы і іншыя сведчанні існавання першабытнага чалавека, ў чаго выніку былі знойдзены ўрны з рэштками трупаспалення.[5.С.258] Акрамя таго І.Сербавым было абследавана 27 курганаў па рэчцы Ухлясці і Перагонцы з аглядам гарадзішчаў і селішчаў, дзе сабрана шмат разнастайных прылад працы. Вынікі даследаванняў



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каля Нова-Быхава і на Сажы былі прадстаўлены даследчыкам у дакладзе на I з'ездзе даследчыкаў археалогіі і археаграфіі, які адбыўся ў Мінску 17-18 студзеня 1926 г.[12.С.58] У тым жа 1925 г. Я.Г.Вяржбіцкі абследаваў курганы і гарадзішчы эпохі жалеза на Калінішчыне і Мсціслаўшчыне, у выніку чаго былі знойдзены ўзоры ганчарнай керамікі.[6.С.276] У наступным 1926 г. І.Сербаў працягнуў даследаванне курганоў, гарадзішч на Магілёўшчыне. У Калінінскай акрузе каля в.Стары Дзедзін быў знойдзены вельмі каштоўны скарб, які складаўся са 183 срэбраных манет, 1 візантыйскай, 1 – нямецкай, частка манет скарба – арабскія дырхемы IX-XI ст.ст. Разам з манетамі ў гаршчку знаходзіліся пацеркі з каляровых каменняў.[7.С.76] А.Л.Аніхоўскі абследаваў месца знаходкі дырхемаў, а таксама курганную групу.[6.С.277] Там жа, у Калінінскай акрузе каля в.Усаўскі Прудок, К.М.Палікарповіч правёў невялікія раскопкі гарадзішча з даславянскай лепленай керамікай.[6.С.278] Прадметы, знойдзеныя І.Сербавым і іншымі даследчыкамі у час раскопак, дэманстраваліся на публічнай выставе, якая адбылася з 12 па 17 лістапада 1926 г. у памяшканні БДМ.[5.С.260]

Зімой 1926-27 гг. гістарычна-археалагічная камісія закончыла распрацоўку анкетнага матэрыяла па складанню археалагічнай карты пэўнага раёну, правяла выбарку адпаведнага матэрыяла з друкаваных крыніц. У выніку, у якасці спробы, была зложана археалагічная карта Магілёўскай акругі.[5.С.260] Упершыню яна была прадэманстравана на II Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе.

У 1927 г. пэўныя змены адбываюцца ў гістарычна-археалагічнай камісіі: з яе складу была вылучана як самастойная адзінка уласна археалагічная камісія. У яе склад ўвайшлі вядомыя археолагі:А.Н.Ляўданскі, К.М.Палікарповіч і С.Д,Дубінскі.

У тым жа 1927 г. І.Сербаў зкончыў даследаванне поля пахавальных ўрнаў і к 1928 г. падрыхтаваў даклад "Раскопкі Нова-Быхаўскага поля пахавальных урнаў".[15.С.252] У 1928 г. археолагі разгарнулі шырокую экспедыцыйную дзейнасць, былі абследаваны шматлікія раёны Беларусі. Так І.Сербаў арганізаваў чарговую навуковую экспедыцыю па р.Ухлясць Магілёўскай акругі "для вывучэння гістарычных межаў, якія праходзілі паміж галоўнымі плямёнамі, склаўшымі беларускі народ – радзімічамі і дрыгавічамі".[14.С.246]. Акрамя яго ў Магілёўскай акрузе вялі даследаванні А.Н.Ляўданскі і С.А.Дубінскі, якія правялі археалагічныя раскопкі ў самім Магілёве, у выніку якіях былі знойдзена лепленая даславянская кераміка. Студэнт-археолаг, член краязнаўчага гуртка БДУ А.З.Каваленя правёў археалагічныя доследы ў раёне паміж Магілёвам і Нова-Быхавам. Вынікам яго раскопак з'явіліся шматлікія знаходкі ўзораў керамікі.[6.С.281]

Акрамя этнографаў і археолагаў некаторыя пытанні матэрыяльнай культуры Магілёўшчыны ў 1920-ыя гг. распрацоўвалі і іншыя секцыі ІБК. Даволі актыўна ў гэтым напрамку дзейнічала падсекцыя па вывучэнню хатніх промыслаў і рамёстваў пры сельскагаспадарчай секцыі.

РЭПОЗІТОРЫЙ БГУКІ

У пачатку 1926 г. гэтай падсекцыяй была распрацавана інструкцыя для запаўнення анкеты аб вясковых промыслах і хатніх рамёствах.[8.СС.73-76] Гэта інструкцыя павінна была садзейнічаць атрыманню вялікай колькасці карыснай інфармацыі пра назвы апрацоўваемай сыравіны, рэчах і таварах, якія вырабляюцца і г.д. У канцы ліпеня 1926 г. ІБК накіраваў экспедыцыю па вывучэнню ткацтва ў Асіпавіцкі раён.[19.С.77-78] Прычым гэты раён быў выбраны невыпадкова, паколькі на 1926 г. і далей ЦБК унесла ў план пробнае краязнаўчае абследаванне тыповага раёну і такім раёнам быў выбраны Асіпавіцкі раён Бабруйскай акругі.[28.С.5] У час экпедыцыі было дасканала вывучана ткацтва Бабруйскай акругі. Зроблены цэлы шэраг запісаў, каля сотні розных замалёвак, выяўлена шмат ўзораў тканін высокай мастацкай вартасці. Аказалася, што Асіпавіцкі раён з'яўляецца як бы " асяродкам усёй Бабруйскай акругі, бо там можна знайсці ўзоры тканін усёй акругі". Акрамя таго для будучага музея было набыта каля 50 адзінак розных тканін.[19.С.78] У 1927 г. прадстаўнікі падсекцыі па вывучэнню хатніх промыслаў і рамёстваў выехалі зноў жа ў Бабруйскую акругу для агляду Бабруйскай акруговай саматужнай выстаўкі. У выніку было атрымана шмат цікавай і карыснай інфармацыі пра майстроў-саматужнікаў, пра іх выбары і г.д.

За 1926-27-ыя гг. падсекцыя разаслала ўсім сельсаветам і краязнаўчым арганізацыям 1500 анкет. Найбольш актыўна прысылалі адказы з Магілёўскай, Бабруйскай і Мазырскай акруг.[20.С.67] У 1928 г. падсекцыя распрацавала праграму для вывучэння ткацтва.[17.С.44-50]

Звесткі аб працы падсекцыі друкавалі ў часопісе "Наш край", іншых беларускіх перыядычных выданнях. Акрамя таго, прадстаўнікі падсекцыі выступалі з дакладамі на ІІ Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе, які адбыўся 10-13 лютага 1927 г.[18.С.25-30, С.57-63], на І Пленуме краязнаўшых арганізацый Мінскай акругі і г.д.[29.С.196-200]

Вялікая работа па вывучэнню матэрыяльнай культуры Магілёўшчыны была зроблена краязнаўцамі. Значнай падзеяй у гісторыі беларускага краязнаўства было стварэнне 29 снежня 1923 г. Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК). У яго склад увайшлі вядомыя вучоныя БССР – У.І.Пічэта, В.Д.Дрышчыц, М.В.Азбукін, А.А.Смоліч і інш. Паступова краязнаўчы рух ахоліваў усё большую колькасць раёнаў.

У сакавіку 1924 г. была склікана Менская краязнаўчая канферэнцыя, 29 лістапада 1924 г. – І Усебеларускі краязнаўчы з'езд. У 1925 пачаў выдавацца першы краязнаўчы часопіс " Наш край", на старонках якога адразу былі надрукаваны 2 праграмы: агульная, якая ахоплівала ўсе пытанні краязнаўчай работы, і прыватная – " Праграма апісання паселішчаў гарадскога тыпу.[16.С.56-58] Значная месца ў гэтых праграмах надавалася пытанням вывучэння матэрыяльнай культуры. На І Усебеларускім краязнаўчым з'ездзе была прынята спецыяльная пастанова, згодна з якой першаснай мэтай навуковай дзейнасці кожнай краязнаўчай арганізацыі на Беларусі было навуковае апісанне свайй

мясцовасці.[11.С.83] Гэта пастанова была падцверджана ў 1927 г. на наступным усебеларускім краязнаўчым з'ездзе.[18.С.61] Яшчэ ў 1926 г., як мы ўжо адзначалі, у план ЦБК было ўнесена заданне зрабіць пробнае апісанне тыповага раёну, якое пры гэтым будзе замяняць сабой падручнік па краязнаўству для культасветных устаноў. Тыповым раёнам быў абраны Асіповіцкі раён Бабрускай акругі. Адказным за рэалізацыю быў прызначаны старшыня Асіпавіцкага раёнага краязнаўчага таварыства Немцаў А.Г. У выніку вялікай работы, якая была здзейснена ЦБК, мясцовымі краязнаўчымі арганізацыямі Асіповіцкага раёну, рознымі секцыямі ІБК, было складзена апісанне Асіповіцкага раёну Бабруйскай акругі. Шэраг артыкулаў, якія ўвайшлі ў зборнік, былі складзены самім Немцавым А.Г. і ўтрымлікаюць значныя матэрыялы па жыллю, адзенню, ежы, прыладах працы.[1.]

Што тычыцца дзейнасці краязнаўчых арганізацый Магілёўшчыны па вывучэнню матэрыяльнай культуры сваёй мясцовасці, то ў гэтым напрамку яны павінны былі кіравацца шматлікімі праграмамі і інструкцыямі па апісанню паселішчаў [16.56-58], па гісторыі і археалогіі [4.С.61-62], па ахове помнікаў старасветчыны [9.С.62-63], па вывучэнню народнага быту [10.С.63-66], па складанню санітарна-бытавога даследавання і апісання вёскі [22.С.81-90] і г.д. Найбольш актыўна ў напрамку вывучэння саёй мясцовасці дзейнічлі Раснянскае раённае краязнаўчае таварыства Калінскай акругі, Пранойскае – Магілёўскай.[18.С.9] Аднак мясцовыя краязнаўчыя арганізацыі праводзілі работы пераважна па выяўленню і вывучэнню помнікаў старажытнасці ў дадзенай мясцовасці. Гэтыя прадметы, калі яны ўяўлялі агульнарэспубліканскую каштоўнасць, адсылаліся ў ІБК і БДМ, ў іншым выпадку стваралі аснову для мясцовага музея. На Магілёўшчыне за 1920-ыя гг. былі створаны сталыя краязнаўчыя музеі ў наступных гарадах: Асіповічах, Быхаве, Мсціславе, Хоцімску, Чэрыкаве, а ў Магілёве дзейнічала Магілёўскае аддзяленне БДМ. На стадыі станаўлення знаходзіліся музеі ў Бялынічах, Клічаве, Шклове і Дрыбіне. Менавіта там былі сканцэнтраваны ўзоры мясцовай матэрыяльнай культуры.

Такім чынам, падводзячы вынікі, можна адзначыць наступнае:

1. Вывучэнне матэрыяльнай культуры Магілёўшчыны ў 1920-ыя гг. праводзілася вельмі актыўна.

2. Асноўнымі арганізатарамі гэтай працы былі секцыі і падсекцыі ІБК, а таксама краязнаўчыя арганізацыі на чале з ЦБК.

3. Вынікам такіх даследаванняў сталі навуковыя даклады на шматлікіх агульнарэспубліканскіх канферэнцыях, канферэнцыях мясцовага характару і канешне публікацыі ў збрніках канферэнцый, перыядычным друку і апісаннях асобных раёнаў.

**Літаратура:**

1. Асіповіцкі раён Бабруйскай акругі. Вып.2. Мн.:ІБК, 1928.

2. Беларусы: У 8 т. т.3: Гісторыя этналагічнага вывучэння /В.К.Бандарчык; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэдкал.: В.К.Бандарчык, М.Ф.Піліпенка, А.І.Лакотка. – Мн.:Беларуская навука, 1999.

3. Веселовская К.В.Обзор этнологической работы в Белоруссии в 1917-25-ые гг.//Этнография. – 1926. – N 1-2.

4. Доўнар-Запольскі М.Ф. Краязнаўчая праца ў галіне гісторыі і археалогіі// Працы Першага Усебеларускага краязнаўчага з'езду 7-11 лютага 1926 г. Мн.: ІБК, 1926.

5. Дубінскі С.А. Археалагічная праца на Беларусі за 1919-28// ПКА, Т 1. Мн., 1928.

6. Дубінскі С.А. Доследы культур жалезнага перыяду на Віцебшчыне, Магілёўшчыне і Міншчыне// ПКА, Т,1. Мн.:ІБК, 1928.

7. Каштоўная . археалагічная находка// Наш край. – 1926. – N 6-7.

8. Інструкцыя для запаўнення анкеты аб вясковых промыслах і хатніх рамёствах Беларусі// Наш край. – 1926. – N 4-5.

9. Мароз А. Ахова помнікаў старасветчыны і прыроды// Працы ... Мн.: ІБК, 1926.

10. Мялешка М.В. Вывучэнне народнага быту// Працы ... Мн.: ІБК, 1926.

11. Пастановы Першага Усебеларускага краязнаўчага з'езду 7-11 лютага 1926 г. у Менску//Наш край. – 1926. – N 2-3.

12. Першы з'езд даследчыкаў беларускай археалогіі і археаграфіі// Наш край. – 1926. – N1.

13. Полымя. – 1924. – N4.

14. Полымя. – 1928. – N3.

15. Полымя. – 1928. – N10.

16. Праграма апісання паселішчаў гарадского тыпу, гарадоў, мястэчак, гандлёвых сёл і г.д.// Наш край. – 1925. – N 1.

17. Праграма для вывучэння прадзення і ткацтва// Наш край. – 1928. – N 3.

18. Працы Другога Усебеларускага краязнаўчага з'езду. 10-13 лютага 1927 г. Мн.: ІБК, 1927.

19. Рак Р.П. Вынікі экспедыцыі па вывучэнню ткацтва ў Асіповіцкім раёне і наогул па Бабруйскай акрузе// Наш край. – 1926. – N 8-9.

20. Рак Р.П. У падсекцыі ІБК па вывучэнню хатніх рамёстваў// Наш край. – 1927. – N 4.

21. Спробнае краязнаўчае абследаванне тыповага раёну БССР// Наш край. - 1926. – N 4-5.

22. Схема санітарна-бытавога даследавання і апісання вёскі// Наш край. – 1927. – N 6-7.

23. Цьвікевіч А. Інстытут Беларускай Культуры. – Мн., 1926.

24. Schelerth T.J. Material Culture Studies in America. Nashville, 1989.

25. ЦНА НАНБ. Ф.67, воп.1, спр.8.

26. ЦНА НАНБ. Ф.67, воп.1, спр.6.

27. ЦНА НАНБ. Ф.67, воп. 1, спр.9.

28. ЦНА НАНБ. Ф.67, воп.1, спр.16.

29. ЦНА НАНБ. Ф.67, воп.1, спр.25.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ